# Зямля і неба

З нотаў кс. Ул. Чарняўскага
Мэлёдыя трад. Гарм. Ул. Неўдах




Сёння ў Бэтлеем, (2)
Дзіўная навіна:
Прачыста Дзева, (2)
Нарадзіла Сына!

Марыя Матка, (2)
Дзіцятка пястуе
І стары Юзаф, (2)
Езуса гадуе.

І каралі тры, (2)
З Усходу прыбылі,
Богу Дзіцяці, (2)
Ахвяры зложылі.

Бліснула Сонца, (2)
Сонца праўды вечнай,
Надзея грэшным, (2)
Шчаслівасці вечнай.

Прыходзьце кожны, (2)
Прывітаць Езуса,
З чыстай душою, (2)
Выслаўляць Хрыстуса.

Будзь жа вітаны і праслаўлёны,
Міласэрны Пане!
Праз Тваю волю - гора, нядоля
Хай жа нас не зможа.